Выстава

# Ад прадзедаў спакон вякоў

**У аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага працуе выстава "Матэрыяльная культура Гродзеншчыны мінулых стагоддзяў: прадметы быту, працы і хатняга ўжытку". Экспанаты для выставы прадставілі гродзенскія калекцыянеры – Януш Парулiс i Аляксандр Сявенка. Што ж цікавае прадстаўляе выстава для гродзенцаў?**

Як расказала галоўны бібліятэкар аддзела мастацтва Людміла Удавенка, выстава носіць этнаграфічны характар. На ёй прадстаўлены прадметы быту, матэрыяльная культура простага люду, які ў сваёй большасці насяляў Панямонне. Экспанаты выстаўлены ў традыцыйным парадку – гэта кераміка, кавальства, дрэваапрацоўка, ткацтва і вышыўка, пляценне з прыродных матэрыялаў і іншыя прадметы побыту. Людміла Леанідаўна адзначыла, што гонарам выставы з'ўляецца вялікая колькасць фотаздымкаў і паштовак, дзе адлюстраваны паўсядзённы побыт мясцовых жыхароў Панямоння ў канцы XIX – першай палове XX стагоддзяў.

Раздзел выставы, які прысвечаны кераміцы Панямоння, вельмі прадстаўнічы. Галоўны бібліятэкар падкрэсліла, што асаблівую цікавасць маюць вырабы чорназадымленнай, поразаўскай керамікі. Незвычайнымі з'яўляюцца і ўзоры кафлі. Сярод іх ёсць фрагменты з ініцыялам "R", якія належалі магнатам Радзівілам. Сваёй разнастайнасцю вылучаецца і гаспадарчы посуд: гаршкі, гладышы, збанкі, патэльні, міскі, талеркі, глякі і інш. Цікавасць выклікае глазураваны збанок з ляпнымі ручкамі. "Асаблівасць яго ў тым, што ён уяўляе сабой своеасаблівы від старажытнай керамікі, які быў распаўсюджаны на Панямонні, у Літве і ў лясной паласе Еўрапейскай Расіі. Гэты посуд выраблялі архаічным кальцавым налепам з наступнай дапрацоўкай яго на ганчарным крузе. Такі спосаб вытворчасці вядомы з жалезнага веку. На Панямонні ён захоўваўся амаль да сярэдзіны XX стагоддзя", – адзначае Людміла Удавенка.

У нашых продкаў вельмі распаўсюджаным было кавальства. Каваль быў паважаным чалавекам. Падковы, страмёны, хамут, званочкі, бразготкі, якімі ўпрыгожвалі вупраж коней у святочныя дні, ключы, замкі, нажніцы – далёка не поўны пералік таго, што выстаўлена ў зале.

Людміла Леанідаўна звярнула ўвагу і на вырабы з дрэва. Асабліва каштоўнай з'яўляецца капліўка з крыжам другой паловы XIX стагоддзя. Яна зроблена ў стылі рэтраспектыўнай готыкі. "Такія капліўкі да паўстання 1863 года ставілі на перакрыжаваннях, пры ўездзе ў населеныя пункты, каля варот сядзіб ці на могілках, затым многія з іх былі дэманціраваны. Да нашага часу іх захавалася няшмат", – растлумачыла галоўны бібліятэкар.

Пашыранымі на тэрыторыі Беларусі былі і вырабы з прыродных матэрыялаў. Людміла Удавенка адзначыла, што асаблівую значнасць мае саломапляценне, бо салома выкарыстоўвалася ў народных абрадах і рытуалах. Выраблялі з яе кошыкі, хлебніцы і іншы разнастайны посуд. Пашыраным было і лозапляценне.

Варта сказаць і аб прадметах, якія маюць дачыненне да жаночай хатняй працы – прадзення і ткацтва. Сярод вырабаў – чаўнок, прасніца, верацяно, пранік, берда, валакі. "Нашы гродзенскія прасніцы адрозніваюцца, напрыклад, ад расійскіх тым, што ў іх радзей выкарыстоўвалася драўляная разьба", – заўважыла Людміла Леанідаўна. "Гродзенскія ручнікі, абрусы, посцілкі адрозніваліся ад іншых невялікай колькасцю арнаменту", – падкрэсліла галоўны бібліятэкар.

Усё тое, што змешчана на выставе, дае магчымасць дакрануцца да гісторыі, зразумець, што беларуская зямля – славутая.

**Вераніка ЯХНО.**